# З новым годам!



# З новым годам!

## Вершы, песні, п'есы, казкі, загадкі



*Мінск*
*"Мастацкая літаратура"*
*2009*

УДК 821.161.3-8
ББК 84(4Беи)
З-11

Укладанне *У. М. Мазго*

Ілюстрацыі *А. В. Пазняка*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-02-1118-7

© Мазго У. М., укладанне, 2009
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2009

Новы год! Новы год!
Весяліцца ўвесь народ...



*Сяргей Грахоўскі*

## Новы год

Паглядзіце! Да варот
Едзе, едзе Новы год!
Гэта ж нам яго прывёз
Барадаты Дзед Мароз,
Падарункаў цэлы воз
І Снягурачку прывёз.
На шляхі і ўзгоркі
Ён рассыпаў зоркі.
Дзед заўзята б'е у ладкі
І вязе нам шакаладкі,
Пернікі і мармелад,
Каб усё ішло на лад,
Каб не беглі самі ў краму,
А пачаставалі маму,
І сястрычак, і сяброў
І каб кожны быў здароў,
Каб на сонечнай зямлі
Ўсе шчаслівыя былі
І каб весела ішлі
Як у тым і ў гэтым годзе
Людзі ў Новае Стагоддзе.

*Рыгор Барадулін*

## Зазірнём у дзедаў мех!

Новы год, Новы год!
Новы снег
І новы лёд.

Зорку зыркую ялінка
Грэе ў даланях яловых.
Ззяе кожная іглінка
У абновах адмысловых.

Рукі ўбокі!
Гэй, у скокі!
Дзед Мароз ружовашчокі
З падарункамі, магчыма,
Мех трымае за плячыма.

Покуль смех
Ад нас не збег,
Зазірнём у дзедаў мех!



*Леанід Дайнека*

## Што прыносіць Новы год?

Што прыносіць Новы год?
Новы снег і новы лёд.
Новы ў полі лыжны след.
Новы ў новы цырк білет.
Новыя канькі, свісткі.
Новыя канікулы.
Новы дождж. І новы гром.
Пераезд у новы дом.
Новы смачны апельсін...
Не злічыць усіх навін!
Дык па-новаму жывіце,
Толькі ўважліва сачыце,
Каб у торбе Дзед Мароз
Новых двоек не прынёс.

*Васіль Зуёнак*

## Каля ёлкі

Новы год! Новы год!
Дружна сталі ў карагод
Вожык і лісіца,
Чапля і куніца.
    Новы год! Новы год!
    Весяліцца ўвесь народ.
Бубен — бух! Бубен — бух!
Сам мядзведзь ідзе на круг.
Зайка касавокі
Скача — рукі ў бокі.
    Новы год! Новы год!
    Весяліцца ўвесь народ.
Дзед Мароз, Дзед Мароз
Падарункаў мех прынёс.
Даў казлу магерку,
А ваўку — цукерку.
    Новы год! Новы год!
    Весяліцца ўвесь народ.

* * *

Студзень тупае ў двары,
Снежань знік у выраі.
Дзякуй,
Добры год стары,
За работу шчырую:
За багаты каравай,
За будоўлі звонкія
І за песні —
З краю ў край
Над усёй старонкаю!
Са Снягуркай Дзед Мароз
Школы ўсе аб'ехалі,
Раздарылі цэлы воз
Забавак з пацехамі,
Пажадалі дружбы ўсім
І прасілі потым,
Каб ніхто з нас не насіў
Цяжкі мех з лянотай...



*Валянцін Лукша*

## Самае салодкае свята

Хоць на святы
Год багаты,
Водзіць шумны карагод,
Я салодкім самым святам
Называю Новы год.

Ноччу ціха-ціха дзверы
Адчыняе Дзед Мароз —
Ён вясёлкавых цукерак
Пад ялінку мне прынёс.

Мандарыны, апельсіны
Развярэдзілі спакой.
Усе галінкі
У ялінкі
Спакушаюць смакатой.

Мілагучна цацкі звоняць,
Радасць зыркі рэй вядзе.
Я ў цукеркавым палоне
Цэлы навагодні дзень.

Ў небе промняцца ракеты,
Весялосці не стрымаць...
Я гатовы свята гэта
Кожны месяц сустракаць!

## Ліст да Дзеда Мароза

У Лапландыю далёкую,
За Палярны круг пішу,
Зразумее Дзед Мароз маю
Сціпла-тонкую душу:

«Пакладзі, прашу, пад ёлку мне
Пачастункаў цэлы мех,
Бо іначай шчасце абміне,
Бо іначай будзе грэх.

Кажуць дзеці, вельмі смелая
Сцежка выбрана мая...
З фізкультураю і спевамі
У злагадзе заўсёды я.

А з прадметамі астатнімі
Цяжкасці заўжды былі.
Сітуацыя няштатная.
Падарункі ўсё ж...
Прышлі».

## За што люблю я Новы год?..

За што люблю я
Новы год?..

За белы снег ля ганка,
Сняжынак сонечны палёт,
Палёт з гары на санках.

За што люблю я
Новы год?..

Канікулы ён дорыць
І мора радасных турбот —
Забаў і гульняў мора.

За што люблю я
Новы год?..

За бляск ялінак стрункіх,
За наш вясёлы карагод,
А больш...
За падарункі.

*Уладзімір Скарынкін*

## Прыгоды снежнай бабы

Снежнай бабе надта сумна
На двары стаяць адной.
У дзіцячым садзе шумна —
Смех вясёлы з гаманой.

Дзеці бавяцца пад ёлкай,
Сустракаюць Новы год.
Бабу снежную з мяцёлкай
Не пазвалі ў карагод.

Каб не холад, не мароз —
Баба не стрымала б слёз.
Вельмі сумна без прыгод
Сустракаць ёй Новы год.

Ды паставіў нехта санкі,
Ёй на радасць, ля альтанкі.
Падышла — і смела
Ў іх з мяцёлкай села.

Едзе баба ўніз з гары,
Бачыць —
ёлка ў гушчары!
Быццам дзіўныя карункі,
На махнатых лапках снег.

А пад ёлкай — падарункі,
Розных цацак цэлы мех.
На пяньку сядзіць Снягурка,
Ля яе —
вавёрка Нюрка.

Ходзіць лесам барадаты
Невясёлы Дзед Мароз.
Касавураць зайчаняты
Вочы на бабулін нос.

І сказала баба ім
З радасцю ў паглядзе:
— Будзе добра вам усім
У дзіцячым садзе.

І прыйшлі ў дзіцячы сад
Дзед Мароз, Снягурка,
Тузін шустрых зайчанят
І вавёрка Нюрка.

Так у садзіку даўно
Музыка не грала.
Задаволена ў акно
Баба пазірала.

Ззяла ёлка, як вясёлка,
Не змаўкаў дзіцячы смех.
Дзед Мароз раздаў пад ёлкай
Падарункаў цэлы мех.

## Чыя ёлка прыгажэйшая?

— Наша ёлка прыгажэй! —
Не нахваліцца Андрэй.—
На яе галінкі ўчора
Клоуна і Чарнамора,
Дзятла,
Зайчаня,
Вавёрку,
Святлафор бліскучы,
Зорку,
Чыпаліна,
Бураціна,
Чаплю,
Стужку серпанціна,
Зіхатлівыя шары,
Лямпачкі і літары
Пачапіла наша мама...

— Ёлка ёсць у нас таксама.
І я думаю, Андрэй,
Наша ёлка прыгажэй! —
Таня хлопчыку сказала.—
Я сама яе прыбрала.

*Ніл Гілевіч*

## Ёлка

Вырасла яліна ў лесе,
Стройная, высокая.
А сягоння Дзед Мароз
Гэту ёлку нам прынёс.
Тут і воўк, і мядзведзь
Паварочваюцца ледзь,
Тут і зайка касавокі
Неадступна пры лісе.
А як кот пайшоў у скокі —
Аж у ладкі білі ўсе:
— Вось дык лоўкасць у ката —
Проста глянуць любата!
А на ёлцы — цацак, цацак!
Ззяюць іскры інею,
І шары на ёй зіхцяцца
Белыя і сінія.



*Мікола Маляўка*

# Ёлачка

У нашай ёлкі-ёлачкі
Абновы ўсе з іголачкі:
Зялёныя галінкі,
І «дожджык», а не іней
На іх, галінках гэтых,
Блішчыць, як цёплым летам.
Аздоблена па-царску:
Шары шкляныя, цацкі
І лямпачак каралі
На ёлачцы заззялі.
За вокнамі — завея,
А нас лясная фея
Сабрала ў карагод —
Вітаем Новы год.

Прыйшоў здалёку ў госці,
Гасцінцы нам прынёс —
І ў ёлачку прыгожую
Ўлюбіўся Дзед Мароз.

## Стары год

Час успомніць нам прадвесне,
Дні сяўбы, пару дажынак —
І з пашанаю правесці
Год стары на адпачынак.
Не таптаўся ён на месцы,
А вяршыў, засноўваў справы,
Ззяюць на грудзях праменна
Знакі плёну, знакі славы.
Мы яго не абгаворым —
Пасівеў за працай рана,
Году новаму не сорам
Павучыцца ў ветэрана.
Прарасце яшчэ зярняткам,
Колас сонечны падыме,
Паспрыяе, каб нашчадкам
Лепш жылося на Радзіме.
І на ганаровай пенсіі
Малады, а не ў маршчынах
Будзе жыць у нашых песнях,
Нашых справах і ўспамінах.

# Лясная фея

У нашай ёлкі-ёлачкі
Абновы ўсе з іголачкі:
Зялёныя галінкі,
І «дождждык», а не іней
На іх, галінках гэтых,
Блішчыць, як цёплым летам.
Аздоблена па-царску:
Шары́ шкляныя, цацкі
І лямпачак каралі
На ёлачцы заззялі.
За вокнамі — завея,
А нас лясная фея
Сабрала ў карагод —
Вітаем Новы год.
Прыйшоў здалёку ў госці,
Гасцінцы нам прынёс
І ў ёлачку прыгожую
Ўлюбіўся Дзед Мароз.

*Уладзімір Карызна*

## Пад Новы год

Белымі снягамі
Закідала ўночку
Сцежкі ўсе з дварамі,
Кусцікі ў садочку.

Снежнае раздолле!
Свет убраўся ў вэлюм.
Стала белым поле,
Неба стала белым.

Рой сняжынак блішча
Весела, як зоркі.
Хораша на лыжах
Праімчацца з горкі.

Смех і гоман звонкі
Ўсюды раздаецца.
А сініца ў вокны
Мякка, снежна б'ецца.

Хочацца праехаць
Кастусю з Антосем,
Вунь Алесь пацешна
Ў снег зарыўся носам...

Лыжнікаў на горцы
Усё болей, болей...
Сэрца вабіць моцна
Снежнае раздолле!

## Гуканне Дзеда Мароза

Дзе ты, добры Дзед Мароз,
Можа, ў лесе ты замёрз?

Чаму к нам не завітаў —
Мо валёнкі пагубляў?

Ці вавёрка спрытнай лапкай
У цябе схапіла шапку?

Дзе ты, добры Дзед Мароз,
Можа, снег цябе занёс?

Ці кажух свой не знаходзіш,
Ці вакольным шляхам ходзіш?

Ці лісічка мех праела —
І ў мяшэчку апусцела?

Дзе ты, добры Дзед Мароз?
Пакажы нам хоць бы нос!

## Навагодняя песенька

З лясной цішы завейнай
Руплівы Дзед Мароз
Нам ёлачку на свята
Вясёлую прынёс.

Зялёныя галінкі
Агнямі зіхацяць.
Не будзеш адзінока
Ты, ёлачка, стаяць.

Мы песняю шчаслівай
Вітаем Новы год.
І зайчыкі, і ліскі,
Ідзіце ў карагод!



*Віктар Шніп*

## Навагодняя казка

У сасоннік белы белая завея
Завяла нас хітра, замяла сляды.
Вогнішча гадую, нас яно сагрэе,
І сябе адчуеш нібы дома ты.

Да агню сініцы прыляцелі грэцца
І табе паселі смела на плячук.
Ля мяне завея плача і смяецца,
Конаўку з гарбатай вырывае з рук.

І агонь танцуе, весялей сініцам.
Да святла жывога выйшлі з цемнаты
Бурыя мядзведзі, пачалі дабрыцца,
Каб на сон ім казку расказала ты.

Нам падносяць мёду поўную калоду,
А ў тым мёдзе пчолы сонечныя спяць.
Ты гаворыш казку пра варкун-дрымоту,
І мядзведзі ціха пад сасной ляжаць.

Адгудзе завея, далеч адымгліцца,
І на дрэвах белых зружавее лёд.
Вогнішча пакінем, грэйцеся, сініцы,
І мядзведзям сонным — у калодзе мёд.

*Сяргей Патаранскі*

## Калядная калыханка

Баю-баю, люлі-люлі —
людзі ў свеце ўсе паснулі,
у калядны, добры час
сон багаслаўляе вас
і анёл сваім крылом
асвячае зорны дом.

Спі, дзіцятка, баю-бай,
хай анёл цябе ўслаўляе,
нібы зорачкі ў нябёсах,
песняй шчаснаю, дзівоснай,
бо ў калядны, добры час
сон багаславёны ў нас.

*Міхась Пазнякоў*

## Ёлка

Прыгажуняю царыцай
Ёлка ў дом да нас прыйшла.
На макушцы, паглядзіце,
Зорка велічна ўзышла.

Зіхацяць шары, звярушкі,
І каралі, і хлапушкі.
І гірлянда ярка ззяе,
Нашу ёлку асвятляе.

Дождждык сонечны іскрыцца.
Будзем, дзеці, весяліцца.
Станем дружна ў карагод,
Прывітаем Новы год.

Дзед Мароз нам са Снягуркай
Прывязуць мех падарункаў.
Дык сустрэнем песняй іх
Як гасцей найдарагіх

І запросім разам з намі
Паспяваць і паскакаць.
Будзем з імі, як з сябрамі,
Новы год наш святкаваць.

## Кружацца сняжынкі

Хто там шустры скача?
Ціха снег рыпіць —
Гэта зайка з дачы
Праз лясок бяжыць.

Кружацца сняжынкі,
Нібы ў дзіўным сне.

Зайка для Дарынкі
Торбачку нясе.

А ў ёй — пажаданні
Добраю расці,
Быць заўжды стараннай,
Шчырай у жыцці.

Хоча ён з Дарынкай
Сам на Новы год
Хоць бы на хвілінку
Стаць у карагод.

Прачытаць ёй вершы,
Песні праспяваць.
Марыць ён найлепшым
Сябруком ёй стаць.

## Вавёркі

Закруціла, замяло,
Снег калючы, шорсткі.
Заспяшаліся ў дупло
Шустрыя вавёркі.

Па галінках скок ды скок,
Нібы акрабаткі,
Сатрасаючы сняжок
Аж да самай хаткі.



Зніклі ў кудзерах сасны
Рыжыя пацешкі.
Там цяпер грызуць яны
Смачныя арэшкі.

Падмацуюцца і зноў,
Мілыя гарэзы,
Шуснуць, шпаркія, далоў
Гарцаваць па снезе.

Прыйдзе ўночы Новы год,
На марозе колкім
Павядуць свой карагод
Рупныя ваверкі.

## Снежны горад

Мы будуем снежны горад
І працуем цэлы дзень,
На работу нашу скора
Будзе люба паглядзець.

Тут дамы, і сад, і школа,
Магазіны і завод,
Паркі выраслі наўкола,
І яшчэ ў нас шмат турбот.

Заўтра горад дабудуем,
А каб ноччу снегавой

Завіруха не задзьмула,
Снегавік стаіць з мятлой.

Навагодняй дзіўнай ёлкай
Упрыгожым горад мы.
З нашай добрай загартоўкай
Не збаяцца нам зімы.

На цэнтральнай нашай вулцы
Узвядзём палац ураз —
Спадабаецца Снягурцы,
Дзед Мароз пахваліць нас.

Будзе свята тут шыкоўным,
Будзе звонкім карагод,
І настрой ва ўсіх — цудоўны,
І шчаслівы — Новы год.

*Алесь Пісьмянкоў*

## Першы снег

— Што, малы, так горка плачаш?
— Выпаў снег, а я — не бачыў!
Падаў снег, а я — прагледзеў!
Не праспаў зіму я ледзьве...
— Твае беды, брат, не беды,
Не рабі ты з іх трагедый:

У зімовай пушчы недзе
Зараз спяць усе мядзведзі...
— Але ж дзеці — не мядзведзі,
Нам цікава ўсё на свеце!

## Азяблая мядзведзіца

Азябла неба ад зімы,
Прылегла неба на дымы.
Вялікая Мядзведзіца
Ад радасці аж свеціцца:
На дзедавай хароміне
Прыгрэлася ля коміна.

*Мікола Чарняўскі*

## Пад Новы год...

Пад Новы год,
Пад Новы год
Дзівос і радасці багата.
Калі ж без ёлкі,
Без прыгод,
Без карнавала,
Што за свята?!

Пад бой курантаў,
Як заўжды,

Агні на ёлцы загарацца,
І Дзед Мароз
Сяброў тады
Пакліча ўсіх
За рукі ўзяцца.

Пад Новы год,
Пад Новы год
Ля кожнай ёлкі —
Карагод.

Пад Новы год
Снягі мятуць.
І ў гэты час
Звяры і птушкі
Твой клопат хочуць
Больш адчуць —
Убачыць поўныя кармушкі.

Сняжынкі-зоркі
Між сабой
Паспелі нагуляцца у жмуркі:
З-пад срэбных веек
Позірк свой
Не зводзяць
З каптана Снягуркі.
Яна ж (ці ўбачыш гэта ў снах?)
Ідзе, а ўподбежкі —
Завея.



А белізна,
А белізна —
Душа нямее!

Гляджу на гэту белізну —
Скупой зімы ўрачысты колер:
Цябе я, Новы год,
Пачну,
Як чыставік
На ўроку ў школе.

## Елачка

Елачку схавала ў снег зіма,
Каб сустрэла ў лесе Новы год,
Каб не адбылося з ёй прыгод,
Елачку схавала ў снег зіма.

Елачкай любуецца сама,
З ёй сняжынкі водзяць карагод.
Елачку схавала ў снег зіма,
Каб сустрэла ў лесе Новы год.

## Завіруха

Выйшла завіруха пагуляць —
Надакучыў ціхі адпачынак.
З ветрам, з карагодамі сняжынак
Выйшла завіруха пагуляць.

Дзе гуляла — гурбы там ляжаць,
Дываны зіхцяць замест сцяжынак.
Выйшла завіруха пагуляць —
Надакучыў ціхі адпачынак.

## Зайкава абноўка

Зайчык рыхтаваўся да зімы,
Кажушок пашыў, як снег той, белы.
Дня не прагуляў ён, змалку ўмелы,—
Зайчык рыхтаваўся да зімы.
Пагайсаць, адстаўшы ад гурмы,
У абноўцы ў поле выбег смела.
Зайчык рыхтаваўся да зімы,
Кажушок пашыў, як снег той, белы.

*Уладзімір Мацвеенка*

## На парозе Новы год

Дзед смяецца:
— Хто ахвочы
Знаць сюрпрыз?
Зажмурце вочы.
Я хоць
І не Дзед Мароз —
Падарунак
Вам прынёс.
Я заплюшчыў. Чую:
— Ах,
Дзед наш
З ёлкай у руках!
Гэта Таня-
Непаседа
Першай зіркнула
На дзеда.
Той рагоча:
— Дзед Мароз
Папрасіў,
Каб я аднёс.
Падарункі,
Дзеткі, вам.
Абяцаў
Прынесці сам.
Ёлачка
Чароўная,
Пышная,

Шыкоўная
Растапырыла
Калючкі,
Быццам цягне
Да вас ручкі.
Кажа:
— Я на карагод,
На парозе —
Новы год!
Сталі ёлку
Прыбіраць
І між іншым
Разважаць.
Вось адкуль
Мароз той знае,
Хто, што
Атрымаць жадае?
Толя — сшыткі,
Лёля — ніткі,
Таня — мішку,
А я — кніжку
І да гэтых
Падарункаў
Цэлую гару
Ласункаў...
Мару я,
Каб Новы год
Быў
Разы са тры
На год.



## Дзед Мароз

Ёлка.
Ззяе хата.
Падарункаў
Воз
Нам прывёз
На свята
ДОБРЫ
Дзед Мароз.
Шчокі
Пафарбуе,
Ушчыпне
За нос,
Бегчы паспрабуе
МОЦНЫ
Дзед Мароз.
Абяліў
Пагоркі,
Снегу шмат
Прынёс
На каткі
І горкі
ДУЖЫ
Дзед Мароз.
Выйшлі мы
Ўсёй школай
Зноў
На лыжны крос,

З намі
Бег ВЯСЁЛЫ,
СПРЫТНЫ
Дзед Мароз.
Адалела
Стома,
Вось бы хто
Падвёз...
Нас давёў
Да дому
ВЕТЛЫ
Дзед Мароз.
— Сябраваць
Давайце,
А вясна
З калёс,
Да зімы
Бывайце, —
Кажа
Дзед Мароз.

## Зімовыя загадкі

*

Што за беленькая мушка
Апусцілася на вушка,
Ледзь чутно паказытала,
Штосьці вушку пашаптала,
І праз міг яе не стала. *(Сняжынка)*

*

Дзве драўляныя пантоплі
Так падобны, як дзве кроплі,
Дзве пятлі, не для красы,
Два задраныя насы.
З горачкі бягуць па следзе,
А на іх дзяўчынка едзе. *(Лыжы)*

*

Што за гаспадар лясны
Спіць пад снегам да вясны,
Ну а летам да калод
Ходзіць красці чужы мёд? *(Мядзведзь)*

*

Не маржы і не дэльфіны
Скокнулі з вады на льдзіны.
Мо ад сцюжы небаракі
Апранулі з пер'я фракі?
Каб сагрэцца, памаленьку
Скачуць танец «Летку-Еньку». *(Пінгвіны)*

*

Што за муляр ноччу быў,
Фарбу белую разліў?
Ранкам глянулі ў акно,
Ды чамусьці ледзь відно.
Ўсюды стала бела, бела,
І зямля папрыгажэла. *(Зіма)*

*

Нарадзілася ў лясочку,
Сярод сосен на пясочку.
Я стаю цяпер у зале,
Мяне дзеці прыбіралі...
Заўтра тут, як і штогод,
Заспявае карагод. *(Ёлка)*

*

Каб мяне пабудаваць,
Трэба вам рыдлёўкі ўзяць.
Сыпаць, сыпаць, трамбаваць
І вадою паліваць.
Заўтра дзеці па чарзе
Будуць ездзіць з мяне ўсе. *(Горка)*

*

Чараўнік ён,
Гэты дзед.
Завітаў к нам
Пад абед.
А праз тыдзень
Лёг наўпрост
Цераз рэчку
Новы мост... *(Мароз)*



* * *

Падары мне, Дзед Мароз,
Цёплы шалік — аж на нос,
У палоску рукавічкі,
Беленькія чаравічкі,
Кажушочак, як у мамы,
Шапку цёплую — таксама —
Ды абвей віхуркаю.
Буду я Снягуркаю!

## Заўтра ранішнік!

Васіль будзе зайкам,
Арцём будзе мішкам,
Аленем — Андрэйка,
Лісічкай — Ірышка,

Настуся — кароўкай,
Вось людзі як людзі!
Мы ж з Гандзяй-сяброўкай
Сняжынкамі будзем.

Спытаеце, можа,
Чаму нас так шмат?

Бо разам мы будзем
Рабіць снегапад!

## Нам бы толькі дацягнуцца

На высокую ялінку
Мы павесім столькі цацак!
Каця — ляльку, я — машынку...
Нам бы толькі падабрацца!

На ялінчыны галінкі
Ладзіць мама, ладзіць тата
Толькі шарыкі ды зоркі.
Дробныя. І небагата.

Нам бы толькі дацягнуцца!
Дзе ў ялінкі вершалінка?
Мог там слонік апынуцца,
Быццам з Афрыкі ялінка!

## Птушыная ялінка

Шукалі мы ялінку,
Шукалі мы па лесе
Яліначку, каб лепшай
У лесе не было:

Чым трэба, не ніжэйшай,
Чым трэба, не вышэйшай,

Ніводнай каб галінкі
Нягожа не расло!

І вось яе мы бачым
На ўзгорачку маленькім —
Выдатную на першы
І на любы пагляд.

На кожную галінку
Чапляем прыгажэнькі
Малы дамок для птушак
Са жменькаю зярнят.

Мы адышлі ад елкі —
І прыляцелі птушкі:
Сінічкі, верабейкі,
Паселі на галлі.

І заспявалі песні,
Нібыта напрадвесні,
І хутка, хутка, хутка
Зярняткі падзяўблі.

Яны казалі: дзякуй
І зноў казалі: дзякуй,
Які абед цудоўны!
Наеліся на год.

А мы вакол ялінкі,
Прыгожай і птушынай,
Музычнай і гасціннай,
Вадзілі карагод!

*Генадзь Аўласенка*

*Вершы для абароны навагодніх касцюмаў*

## Навагодні верш Вавёркі

Я — прыгожая Вавёрка!
Ці пазналі вы мяне?
У мяне — дупло-каморка
на высокай на сасне.
Ды чамусьці сумна стала
у дупле адной сядзець.
Я да вас і завітала,
каб на свята паглядзець!
Каб, з вясёлым жартам-смехам,
вашы гульні падтрымаць,
у Дзядулі прама з меха
падарунак атрымаць!
Каля ёлкі з карагодам
пахадзіць, патанцаваць...
І са святам, з Новым годам,
вас усіх павіншаваць!

## Навагодні верш Рамонка

Я — Рамонак, кветка лета!
Ды, нягледзячы на гэта,
сёння я да вас прыйшоў,
шмат сяброў сабе знайшоў
у прыгожай гэтай хаце,
на вясёлым гэтым свяце,
на цудоўным карнавале!
Мы спявалі, танцавалі,
мы вадзілі карагод,
сустракалі Новы год!
Сам Дзядуленька Мароз
падарункі нам прынёс.
Разам з намі ён спяваў,
падарункі раздаваў.
І таму надзею маю,
што цукеркі атрымаю.
Так, Дзядуленька Мароз?
Нездарма ж я ўзімку рос!

## Навагодні верш Вожыка

Я — малы калючы Вожык!
Я — зусім як ёлка!
Хоць не вельмі я прыгожы,
Але ёсць іголкі!
Хоць зімой мне трэба спаць —
З вамі весялюся!
І жадаю сябраваць,
Вось і не калюся!

## Навагодні верш Пірата

Ну а я — марскі Пірат!
Але ж гэта маскарад!
Вы не бойцеся мяне —
Сёння я не на вайне!
Сёння я ўсіх вас люблю
І ў палон не захаплю.
Карагод вясёлы ваш
Не вазьму на абардаж.
Сёння я не страшны...
Не!
Вы не бойцеся мяне!
Не глядзіце, што пірат...
Гэта ж проста маскарад!

## Навагодняя песня

Ёлачка, яліначка,
Колкая галіначка!
Ты прыйшла да нас на свята,
Сёння ў нас гасцей багата!

Гэй, хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!
Нас чакае шмат прыгод!
Шмат прыгод!
Шмат прыгод!
Нас чакае Новы год!
Новы год!
Новы год!
Дык хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!

Нам Дзядуленька Мароз
Падарункаў мех прынёс.
Там і цацкі, і ласункі,
І другія падарункі!

Гэй, хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!
Нас чакае шмат прыгод!

Шмат прыгод!
Шмат прыгод!
Нас чакае Новы год!
Новы год!
Новы год!
Дык хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!

Сёння рыжая Лісіца
Разам з Зайцам весяліцца!
Сёння з імі (смех, дый годзе!)
Нават Воўк у карагодзе!

Гэй, хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!
Нас чакае шмат прыгод!
Шмат прыгод!
Шмат прыгод!
Нас чакае Новы год!
Новы год!
Новы год!
Дык хутчэй у карагод!
Карагод!
Карагод!



*Павел Саковіч*

## Дзед — вязальшчык

Перад Новым годам Ала
Аднакласнікам сказала:
— А мой дзед — вязальшчык лоўкі,
Робіць розныя абноўкі,
А ягоныя карункі,
Як прыгожыя малюнкі.
Ён шчыруе ўдзень і ўночы,
Нават есці, піць не хоча.

Тут настаўніца сказала:
— Дзівакоў такіх я знала.
Іх, вязальшчыкаў, на свеце
Ўжо не так і многа, дзеці.
Прывядзі нам, Ала, дзеда,
Як імя яго, паведай...
Аднакласнікам з хітрынкай
Адказала так дзяўчынка:
— А ў мяне няма сакрэтаў,
Дзед Мароз звычайны гэта!

## Дзед Мароз і Міхасёк

Міхасёк святочным ранкам,
Захапіўшы ў сенцах санкі,
Выйшаў, стаў сярод двара.
Дзе ж гуляе дзетвара?

Тут з'явіўся Дзед Мароз
І адразу — цап за нос!
Ну а потым, быццам жартам,
Ушчыкнуў за вуха раптам.

Хлопчык здзекаў не стрываў —
Драпака адразу даў.
На крутую горку ўцёк
Ад марозу Міхасёк.

Дзед Мароз такі старэнькі,
У яго баляць каленкі.
Ён ад хлопчыка адстаў
І... чапляцца перастаў!

*Артур Вольскі*

## Калядкі

Гой, ладачкі-ладкі,
надышлі Калядкі!
Надышлі Калядкі —
напяклі аладкі.

Мы надралі таркаю
дранікі духмяныя.
Хочаш —
  еш са скваркаю,
хочаш —
  са смятанаю.
Вось вам,
  калі ласка,
з жэрдачкі каўбаска!
Вось кавалак пірага,
каб не брала вас туга.

Гой, ладачкі-ладкі!
І мядок салодкі
да лясной гарбаткі
наліём у сподкі.
І запахне рутай,
верасам,
чаборам,
каб зімою лютай
нам не знацца з горам.

Бярыце з талеркі
лізунцы,
цукеркі!
Цешце сябе,
цешце,
галубкі,
галу́бкі!
Ешце ўволю,
ешце,
да не псуйце зубкі.

Бохан —
поўняй яснаю.
Яйкі.
Бульба.
Скваркі.
Гэта ўсё —
з уласнае
нашай гаспадаркі.

Калі вам прысмакі
прыйдуцца да смаку,
прынясіце людзям
шчырую падзяку.

Гой, ладачкі-ладкі —
пляскаем у ладкі.
Гой, ладачкі-ладкі —
святкуем Калядкі!



## Як мы рады...

Як мы рады, як мы рады,
Як мы рады!
Новы год прыйшоў,
Прыйшлі Каляды.
    Новы год,
    Новы год,
    Мы вітаем твой прыход!
Воўк па лесе, воўк па лесе
Сцежкі меціць.
І чаго ты, воўк,
Завыў на месяц?
    Лоп-лоп-лоп,
    Туп-туп-туп —
    Заяц воўку выбіў зуб!
А лісіца, а лісіца,
А лісіца
Больш не будзе ўжо
Хвастом хваліцца.
    Лоп-лоп-лоп,
    Туп-туп-туп —
    Заяц лісцы хвост абскуб!
Біце ў ладкі, біце ў ладкі,
Біце ў ладкі —
Заяц пасадзіў
Капусту ў градкі.
    Лоп-лоп-лоп,
    Туп-туп-туп —
    І не трэба зайцу круп!

Ды прыйшлі аднойчы
Воўк з лісою,
Пасцінáлі ўсё
Наўкол касою.
Лоп-лоп-лоп,
Туп-туп-туп —
Хоць ты сам кладзіся ў суп!
Гэта жарты, гэта жарты,
Проста жарты.
Сябраваць усім
На свеце варта!
Туп-туп-туп,
Лоп-лоп-лоп —
Ах, як весела было б!
Як мы рады, як мы рады,
Як мы рады!
Новы год прыйшоў,
Прыйшлі Каляды.
Новы год,
Новы год,
Мы вітаем твой прыход!



*Максім Танк*

## Заяц і ёлка

Уцякаў маленькі заяц
Ад лісіцы:
— Паратуй мяне,
Бярозанька-сястрыца,

Або ты,
Дубок-асілак нашай пушчы,
Ці алешанька
Ў сваёй зялёнай гушчы,

Ці пад засенню
Асінка-палахліўка,
Ці ў вавёрчыным прыстанішчы
Ляшчынка.

Ды з усіх дрэў
Зайку ўратавала толькі,
Сваймі лапкамі прыкрыўшы яго,
Ёлка.

Аб чым мне паведаў
Зай ў калядны вечар,
І прасіў не крыўдзіць ёлку
І не секчы.

*Уладзімір Мазго*

## Дзе жыве Дзед Мароз

Дзе жыве ў нас
Дзед Мароз:
У Гародні,
Мінску,
Пінску?
Атрымаў ён —
Усур'ёз! —
Белавежскую прапіску.
Дзед Мароз
Абходзіў пушчы,
Як ляснік,
Арэшкі лушчыў.
А за ім ішлі
Сябры —
І вавёркі,
І зубры,
І мядзведзі,
І дзікі —
Да ялінкі нацянькі
Запрасіць
На Новы год
У вясёлы карагод.

Смелы зайчык
Глянуў скоса:

— Калі, Дзед,
У нас жывеш,—
Рэзідэнцыяй Мароза
Абвяшчаем Белавеж!

## Каляда

Звоняць бомы, едуць сані
Па святочнай белізне.
Мы не знаем нават самі:
Ці наяве, ці у сне?..

Глуха вые завіруха,
Замятаючы сляды,
Сагравае маладуху
Пацалункам малады.

— Каляда, каляда! —
Весяліцца грамада,
Падаруначкі нясе
Калядоўшчыцы-казе.

Каляда, каляда!
Нават холад — не бяда.
Заспяваюць палазы —
Уцякаюць маразы.

Хай ляцяць, як птушкі, коні
За бялюткі далягляд
І паўсюль світаюць гоні,
Асвятляючы пагляд.

І няхай зіма лютуе
Завірухай да нябёс —
Каляда накалядуе
Нам усім шчаслівы лёс.

— Каляда, каляда! —
Весяліцца грамада,
Падаруначкі нясе
Калядоўшчыцы-казе.

Каляда, каляда!
Нават холад — не бяда.
Заспяваюць палазы —
Уцякаюць маразы.



*Казімір Камейша*

## Белая цішыня

І куст, і дрэва заміраюць,
З галінак снег паабвісаў.
Тут скрозь —
                    ад краю і да краю —
Ляжыць спакою паласа.

Калі ж патухнуць зоры ранкам,
Па гэтай соннай паласе,
Аддаўшы цішу калыханкам,
Блукае снежань-дрывасек.

Ён дзень усмешкаю вітае,
Зімой закалыханы ён.
Камель ямчэйшы выбірае
І слухае знаёмы звон.

Вятрэц галінкі не калыша,
Зарой праменіцца кара.
І падае у гэту цішу
Апошні ліст календара.

*Алесь Жыгуноў*

## Сняжынка

Прывядзе мяне сцяжынка
На дзіцячы Новы год,
Над сняжынкаю сняжынка
Кружыць, водзіць карагод.
Снегу белага нямала,
А мароз такі круты!
Я ў сняжынкі запытала:
— Ну куды, малеча, ты?
Я пачуць адказ хацела.
Я магла б з ёй падружыць,
Ды сняжынка паляцела,
Каб ля елкі пакружыць.

*Міхась Скобла*

## Каляда

Калі снег ідзе, калі дожджыкі
смачна спяць ў хмарах пуховых,
па мястэчку ідуць калядоўшчыкі:
— Гэй, выносьце, што ёсць ў сховах!

За каўбаску —
паслухайце казку.

Казкі мала —
выносьце сала,
каб душа спявала!

Песняў мала — мы паскачам
і за ўсё, за ўсё аддзячым.

Гаспадар, чаму не ў гуморы?
Ці прысмакаў ніякіх няма?
Хай Каза пашукае ў каморы,
можа, што ўпадабае сама.

Дзе Каза рогам —
там жыта стогам.

Дзе Каза хвастом —
там жыта кустом.

Каб я еў і піў, і жыў там —
у каморы, поўнай жытам!

На заснежаныя пагоркі
касавурыцца поўня ў адчаі.
Яна ў шчодрай Каляднай Зоркі
на ўсю ноч святла пазычае.

*Міхась Сазончык*

## Навагодні светлячок

Бабуля наша — светлячок,
І цёпла ў хаце роднай,
І вокны свецяцца здалёк
У вечар навагодні.

Прыйшоў нарэшце Дзед Мароз
З мяшком у нашу хату,
Ён падарункаў шмат прынёс
На радасць мне і брату.

Мы сустракаем Новы год,
Бабуля стол накрыла.
На ім багата страў-шчадрот...
І свечку запаліла.

Не затуманіць ёлку змрок
У вечар навагодні:
Бабуля наша — светлячок,
І светла ў хаце роднай.

*Аксана Спрынчан*

## Навагоднія парады

Каб не спаць на Новы год,
Як барсук альбо мядзведзь,
Варта сон увесну мець,
Варта сон улетку мець,
Трэба сон увосень мець.

Каб лятаць на Новы год —
Не злятаць у цёплы край,
Варта верыць, што тут рай,
Трэба тут любіць свой рай,
Спадзявацца, што тут рай.

Каб спяваць на Новы год
І з настроем, і з дудою,
Варта год сустрэць з душою,
Трэба год рабіць з душою
І правесці год з душою.

## «Гвін» — заўсёдны код пінгвіна

Забыў пінгвін пін-код,
Стаіць і ледзь не плача:
На носе Новы год,
А тут адны няўдачы.

— Як без мабілы быць?
Як павіншую цётку?
Як мілай хроснай жыць,
Як не спяю ёй нотку?

— Ну што,— крычыць цюлень.—
То не ў пінг-понг гуляцца.
Пін-код твой кожны дзень
Стаміўся вымаўляцца.

Пінгвін, адкрый свой рот,
«Пін-гвін» кажы бясконца,
Бо «гвін» і ёсць пін-код
Мабільнага аконца.

## Сем снежных «я»

Баба снежная ў самоце:
Толькі гіль сядзіць на плоце,
Дзеда не відно.

Новы год надыдзе хутка,
Засталіся толькі суткі.
Сына не відно.

З’ехала на бок вядзерца,
Слёзак ёсць ужо азерца —
Ўнукаў не відно.

«Новы ж год заўжды вясёлы,—
Скажуць гарады і сёлы.—
Суму не відно».

З хаты выбягае Воля:
Столькі снегу, столькі волі.
Дзетак не відно.

Ды яна чакаць не стала,
Лепіць дзеда, лепіць дбала.
Сына не відно.

Снежны дзед стаіць вусаты,
Лепіцца і сын насаты.
Ўнукаў не відно.

А цяпер са снегу ўнукі
Лезуць-лезуць без прынукі.
Свята не відно.

А як снежная сям'я
Падлічыла — нас сем «я»,
Столькі радасці відно,
Столькі галасоў чутно,
Нібы Новы год даўно.

*Віктар Шымук*

## Якім ты будзеш, Новы год?

Якім ты будзеш, Новы год,
Што прынясеш ты людзям?
...Сняжынак белы карагод
Развеяў ціха студзень.
І навакол — снягі, снягі
На сонейку іскрацца.
У снезе — рэчак берагі
І гарадоў палацы.
Завеяны лясы, лугі
Бялюткаю парошай.
У снезе край мой дарагі —
Ад Гродна і да Оршы.
Хачу, каб так было заўжды —
Спакойна, чыста, светла.
Каб белы снег,
Не войнаў дым,
Кружыўся над планетай.



*Ніна Галіноўская*

## Перад Новым годам

Лыжы мчацца.
Што за крос?
Гэта едзе Дзед Мароз.
Дзед ляціць, як чэмпіён,
Бо спяшае ў краму ён.
Купіць футра там другое:
Закароткае старое.
Шапку, шалік, рукавіцы
Абнавіў Дзед у хімчыстцы.
Барада ў яго да пят —
Так не пойдзеш у дзетсад.
У цырульню едзе Дзед —
Падстрыгуць няхай як след,
Дзын-н! — будзільніка сігналы.
Едзе Новы год з вакзала.
Дзед Мароз надзеў абновы —
Новы год страчаць гатовы.
І на ранішнік якраз
Прыйдзе Дзед Мароз да нас.

## Навагодняе

Сягоння ёлка ў цэнтры.
Увага ёй, лясной,
І балі, і канцэрты,
І чэсць, як маладой.
Вянкамі карагоды
Плывуць вакол яе.
— Віншую з Новым годам! —
Гадзіннік гучна б'е.
Надзеі, пажаданні
У кожнага свае,
І тосты, віншаванні...
Год Новы раздае:
— Бадзёрасць? — калі ласка,
Усмешкі? — дам для ўсіх...
Навокал маскі, маскі.
І не пазнаць сваіх.
Здаецца, грэе ёлка
Агністай цеплынёй,
Бы летняя вясёлка
Успыхнула на ёй.

## Ёлчына свята

Сябры дарагія,
Прыходзьце ў дзетсад
На ёлчына свята —

На баль-маскарад.
На ёлцы сягоння
Дзівоснейшы ўбор,
На лапках зялёных
Па тысячы зор.
Вы будзеце з намі
Вадзіць карагод.
Як слаўна з сябрамі
Сустрэць Новы год!

## Чарадзейны сайт

— Падары мне, Новы год,
Шмат дзівосаў і прыгод.
Памажы праз інтэрнет
Мне пабачыць увесь свет.
Пабываць на ўсіх планетах.
Марыў я даўно аб гэтым.
— Хлопчык, сайт я дам надзейны:
Будзе ночка чарадзейнай,
Сайт загадкавы ў мяне,
Ён працуе толькі ў сне.
Як цябе агорне сон,
Тут жа запрацуе ён.
А калі ты фантазёр,
Дык злятаеш і да зор.

## Паўтарыся, сон

Што толькі не прысніцца!
Я раскажу свой сон.
Прыйшлі на ёлку: львіца,
Вярблюд, асёл і слон,
Хатабыч, Бураціна,
Жырафа, бегемот,
Нязнайка і Мальвіна,
Куніца і янот,
Царэвіч, Папялушка,
Бабуля Шапакляк,
Дзюймовачка, Жар-птушка,
Ліса і Зай-бяляк.
А Бармалей на санках
Прывёз Бабу Ягу.
Сам дзіўнагорскі Янка
Ёй падкаваў нагу.
Зубра і Чабурашку
Вёз Конік-Гарбунок.
Леў апрануў цяльняшку,
Чуб зачасау набок.
А Віні-Пух на поні
Прыехаў з Калабком.
Прыпудраныя скроні
Пушысценькім сняжком.
Святочная паляна
Скакала і гула.
Царэўна Несмяяна
Смяяцца пачала.

Сюрпрызы, гульні, жарты...
Ніхто не сумаваў.
Таіць ад вас не варта —
І я там пабываў.
Са мной Вясёлкін Вася
Спяваў і танцаваў.
А Карлсан так стараўся:
Без трэску ён лятаў.
Заціхлі крокі ночы.
Кудысьці знік мой сон.
Хачу, хаця б аднойчы
Каб паўтарыўся ён.



*Віктар Гардзей*

## Снегавік

На двары і шум, і смех.
Капяжы цурчаць са стрэх.

— Да цяпла я не прывык,—
Плача бедны Снегавік.

Свеціць сонца ўсё ярчэй —
Слёзы капаюць з вачэй.

Плакаў, жаліўся бядак,
Аслабеў, зусім абмяк.

Дзе схаваўся Снегавік?
Дзе ён, сплакаўшыся, знік?

Хлопцы па двары ішлі —
Толькі лужынку знайшлі.

## Зімовая казка

Зімовы лес дзівосны —
Не лес, а проста казка.
Заснежаныя сосны
Стаяць у белых масках.

Красой зачараваны,
Мароз трашчыць нядрэмна.

Пустэльныя паляны
Здалёк мігцяць таемна.

Завея тут хадзіла
Пужліваю ласіхай
І выбілася з сілы,
І стала ў лесе ціха.

Сумёты пры ялінах
Стаяць, нібы палаткі.
Там спяць, як у пярынах,
Глушцы і курапаткі.

## У зімовым лесе

Ціха-ціхутка
Дрэмлюць паляны.
Коўдрай бялюткай
Долы засланы.

Заяц пад хвойкай
Спаў гэтак міла,
Ледзь яго сойка
Ранкам збудзіла.

З боку балота
Кралася ліска —
Мыш у сумёты
Шуснула з піскам.
Спелую шышку

Лушчыць ваверка.
Воўк у зацішку
З'ехаў з пагорка.

Лес абудзіўся
Рыкам ласіным.
Клён пахіліўся.
Мёрзнуць асіны.

Даль барвавее.
Ціш азалела.
Белай завеяй
Ноч адшумела.

## Добры снегавік

Каля вербаў белакосых
Снегавік стаіць бязносы.

З вербаў каркаюць вароны:
— Дзе ты дзеў свой нос чырвоны?

Азірнуўшыся на поплаў,
Снегавік прамовіў цёпла:

— З морквы нос мой старамодны
З'еў са смакам зай галодны.

## Белячок

Ранкам зайчык-белячок
З-пад куста на сцежку — скок.
Толькі міма дрэў прабег,
Бачыць — снег, навокал снег.
Засмяяўся белячок:
— Ой, пайшоў, пайшоў сняжок!
Ну цяпер мяне і днём
Воўк не згледзіць пад кустом.

## Мядзведзева лапа

Спаць мядзведзь лёг пад сасонку,
Лапу смокча ён спрасонку.

Дзень марозны, дзень халодны.
Воўк ідзе між дрэў галодны.

І зайцы, і курапаткі
У свае ўцякаюць хаткі.

Шэры ледзьве цягне ногі
Ля мядзведзевай бярлогі.

«Вось хто можа без абеду»,—
Пазайздросціў воўк суседу.

У бярлогу суне зяпу:
— Пасмактаць і мне дай лапу!

## Недарэмная любоў

Бабу снежную зляпілі
І пайшлі хлапцы дамоў.
Тут на выган праз паўхвілі
Зайка выскачыў з кустоў.

Бачыць: кош замест кароны
У «старой» на галаве,
Вочы з вуглю, нос чырвоны —
Чым не цешыцца б дзятве!

Зайка бабу любіць дужа,
Днямі кружыць ля яе,
Але ўжо не вее сцюжа,
Снег патрошку растае.

Выб'ецца ручай спаднізу —
Баба снежная ўпадзе.
Зайка шлындае паблізу,
З бабы вока не звядзе.

Стала ціха і сугрэўна,
Пачарнеў на рэчцы плёс.
Зайка бабу любіць, пэўна,
За чырвоны — з морквы! — нос.

*Яўген Міклашэўскі*

## Навагодняя ноч у лесе

Цішыня і бязлюддзе.
Лес цямнее стары.
Мне сказалі, што будзе
Баль заечы ў бары.

Я — на лыжы і бегам
Па бялюткім сняжку.
Во, прыглушаны снегам,
Нейкі рух у ляску.
Поўнач. Зорак трымценне.
Рассыпаецца змрок,
І заечыя цені
Замігцелі здалёк.

Стол святочны сабраны
На сасновых камлях.
Чыстым снегам засланы,
Ён смалою прапах.
Дзе прайшлі дрывасекі —
Духам смолі нясе.
На лясныя прасекі
Азіраліся ўсе.
Хваляваліся госці,
Ды ні гуку нідзе.

Раптам выгукнуў хтосьці:
— Не шуміце! Ідзе...

Ціха сцежкай лясною
Падышоў Дзед Мароз —
У мяшку за спіною
Падарункі прынёс:
Чарадзейныя кніжкі
Для малых зайчанят,
Ну, вядома, і «Мішкі»,
і «Лясны шакалад».

За гасціннай бяседай
Жартаваў Дзед Мароз,
І, як морква, у Дзеда
Чырванеў толькі нос.

За-за стала падняліся —
Загулі, як чмялі.
А за лапкі ўзяліся —
Карагод павялі:
*«Ззяйце, зоры, і мігціце,*
*Году Новаму свяціце,*
*Каб усім наш шчодры лёс*
*Шчасце новае прынёс!»*

Уключылі транзістар —
Колькі можна спяваць!



Польку жвава, са свістам,
Пачалі танцаваць.
І прапаў у нябогі
Мішкі бурага сон:
Ён вылазіць з бярлогі —
Трэск па лесе чуцён.
— Гэй, каціце калоду!..
А яе — не падняць:
Мусіць, поўная мёду —
Будзе чым частаваць!

І накінуўся Мішка,
Самы лепшы ядок,
З самай большаю лыжкай
На духмяны мядок.

А зайцы... Сон ціява?
Што да іх прывяло?
Помню, сорамна нават
Перад імі было.
На палетках зімовых,
На дарогах лясных
Б’юць па іх з дубальтовак,
Слепяць фарамі іх.
А яны так гасцінна
Сустракалі мяне.
Людзі, мы не павінны
Несці смерць звярыне!..



А натоўп ля мядзведзя,
Як раней, гаманіў.
Ён сказаў мне: «Суседзе,
А цябе я ўжо сніў».
Прысланіўся да кадкі
І заснуў пад канец.
Нехта пляскаў у ладкі:
— Маладзец, маладзец!..
Хтось на скрыпцы пілікаў...
Як я трапіў на баль?
Шэры зайчык паклікаў,
Незнаёмы, на жаль.

# Навагодні карагод



# ЯЛІНАЧКА

*Словы З. Аляксандравай* *Музыка М. Красева*
*Пераклад В. Жуковіча*




Ў лесе ялінaчцы
Холадна зімой.
З лесу ялiначку
Мы ўзялі дамоў.

Наша яліначка
Свеціцца-гарыць:
Снег на галіначках,
Яркія шары.

Цацкі прывабныя
Ззяюць угары
І шакаладныя
Рыбкі і звяры.

Мы пад яліначкай
Сталі ў карагод.
Весела, весела
Стрэнем Новы год.

# СПОЎНЕНАЕ ЖАДАННЕ

*Словы В. Жуковіча* *Музыка Э. Казачкова*




Што увечары заснула,
Шкадавала Каця:
Ноччу Дзед Мароз прыходзіў,
Ёй сказала маці.

Кнігу казак разгарнула
Каця з захапленнем.
Дзед Мароз прынёс ёй кнігу,
Тут няма сумнення.

Але ўсё-такі ў дзяўчынкі
Ёсць адно пытанне:
Як жа Дзед Мароз уведаў
Пра яе жаданне?

# ЯЛІНАЧКА

*Словы Р. Кудашавай*
*Пераклад В. Жуковіча*

*Музыка Л. Бекмана*




Жыла-была ялiначка,
У хвойнiчку расла,
Зiмой i летам стройная,
Зялёная была.

Мяцелiца ёй песеньку
Спявала: «Баю-бай!»,
Сняжком яе атульвала:
«Глядзi не замярзай!»

Пужлiвы зайка шэранькi
Вакол яе скакаў,
Падчас i воўк, сярдзiты воўк
Трушком тут прабягаў.

Сняжок у лесе сцiшаным
Пад полазам рыпiць,

І конік жвавы сівенькі
Спяшаецца, бяжыць.

Імчацца лёгка саначкі,
А ў санках мужычок
Вязе для нас яліначку,
Паклаўшы на бачок.

І вось яна, прыбраная,
На свята к нам прыйшла
І шмат пацехі, радасці
Для дзетак прынясла.



# НАВАГОДНІ КАРАГОД

*Словы В. Лучанок* *Музыка І. Лучанка*




Станавіцеся хутчэй у карагод!
Надыходзіць, надыходзіць Новы год!
І чакаюць яго ўсюды.
Абяцае многа цудаў
Радаснае свята — Новы год! *(2 разы)*

Скора, скора завітае Дзед Мароз.
Падарункаў прынясе ён цэлы воз.
Мы дзядулю сустракаем,
Звонка, весела спяваем.
Слухай, калі ласка, Дзед Мароз! *(2 разы)*

Надыходзіць, надыходзіць Новы год.
Мы вавёрачку пазвалі ў карагод,
Зайку, вожыка, лісіцу —
Будзем разам весяліцца.
Кружыцца святочны карагод! *(2 разы)*

Дзед Мароз прыйшоў з гасцінцамі, ура!
І агеньчыкі запальваць нам пара.
Дружна скажам: «Раз, два, тры,
Ярка, ёлачка, гары!»
Радуецца святу дзетвара! *(2 разы)*

# ПЕРШЫ ШКОЛЬНЫ НОВЫ ГОД

*Словы А. Вольскага* *Музыка Г. Вагнера*



Не баіцца зайчык воўка,
І лісічцы пеўнік рад.
Гэта дружная «нулёўка»
Пачынае маскарад.

Прыпеў:
Ах, якая ёлка ў школе!
Станавіся ў карагод.
Не забудзем аніколі
Першы школьны Новы год.

Асыпае нас праменнем
Зорны рой сярод зімы...
А наступны год сустрэнем
Першакласнікамі мы.

Прыпеў:
Ах, якая ёлка ў школе!
Станавіся ў карагод.
Не забудзем аніколі
Першы школьны Новы год.
Першы школьны,
Першы школьны Новы год.

# ЁЛКА-ВЯСЁЛКА

*Словы М. Чарняўскага* *Музыка А. Ізотава*




Завітала ў госці ёлка —
З намі Новы год спаткаць.
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Рада пець і танцаваць.

Зухаваты, барадаты,
Сыпле жарты Дзед Мароз.
Са Снягуркаю на свята
Падарункі ён прынёс.

Вочы весняцца ў Снягуркі,
Добра ўсім каля яе:
Нам Снягурка падарункі,
Як усмешкі, раздае.

Што за дзіва — наша ёлка!
Што за свята — Новы год!
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Водзіць з намі карагод.



# ЧАРАЎНІЦА ЁЛКА

*Словы У. Мазго* *Музыка У. Сарокіна*






Мы цэлы год,
Мы цэлы год яго чакаем,
А потым водзім карагод
І першым тостам,
Першым тостам сустракаем:
— За Новы год —
Шчаслівы год!..

Наколькі ён,
Наколькі ён вясёлым будзе —
Залежыць толькі ад людзей.
Хай Новы год,
Хай Новы год прыносіць людзям
Святло надзей,
Цяпло надзей.

Чараўніца ёлка,
Ярка загарыся
Казачнай вясёлкай
У зімовых высях!

Збудзецца, я знаю,
Светлае жаданне:
Золушка лясная
Каралевай стане.

Дай Новы год,
Дай Новы год цудоўных песень,
Святлом натхнення азары.
І на Дняпры,
І на Дзвіне, і на Палессі
Мае сябры —
Твае сябры.

Няхай усе,
Няхай усе спяваюць людзі,
І мірна кружыць канфеці.
Хай Новы год,
Хай Новы год шчаслівым будзе
Ў маім жыцці,
Ў тваім жыцці!..

Чараўніца ёлка,
Ярка загарыся
Казачнай вясёлкай
У зімовых высях!

Збудзецца, я знаю,
Светлае жаданне:
Золушка лясная
Каралевай стане.



# ЦУДОЎНЫЯ СВЯТЫ

*Словы В. Жуковіча* *Музыка А. Рэмізоўскай*




Вялікую радасць
На вуліцы, ў хаты
Прынеслі Каляды,
Зімовыя святы.
Прынеслі забавы,
І жарты, і песні,
Загадкі і гульні,
І танцы прынеслі.

Не спі, пані скрыпка,
І, бубен, прачніся, —
Цудоўныя святы
У нас пачаліся.

Скрыпучы марозік,
Сняжок белы, чысты.
Настрой наш вясёлы,
Настрой урачысты.



# ТАЎКАЧЫКІ

*Словы М. Маляўкі* *Музыка У. Казбанава*



Скача, скача наша ступа,
Ды з ячменем — глянуць люба!
Ой каляды, ой калядкі,
Чыста лушчацца зярняткі.

Прыпеў:

Стуку-стуку, таўкачыкі,
Стуку-стуку, дубовыя.
Сем год валяліся,
Ў адну ступу сабраліся[1]. *(2 разы)*

Без куцці якое свята,
Без куцці — скупая хата!
Скача, скача ступа наша:
Будуць крупы, будзе каша.

Прыпеў. *(2 разы)*

Светла ў хаце ад ячменю,
Падсыпай за жменяй жменю.
Чыста лушчацца зярняткі,
Запрашаем — на калядкі!

Прыпеў. *(2 разы)*

---

[1] Прыпеў — словы народныя.

# СЁННЯ СВЯТА НОВЫ ГОД

*Музыка і словы Я. Жабко*



Сёння свята Новы год,
Станем дружна ў карагод.
Будзем песенькі спяваць,
Падаруначкі чакаць.

Прыпеў:

Ёлачка, ёлачка, на макушцы зорачка,
Ёлачка, ёлачка ў госцейкі прыйшла.
Ля-ля-ля-ля-ля-ля, ёлачка,
Ля-ля-ля-ля-ля-ля, ёлачка,
Ля-ля-ля-ля-ля-ля, ёлачка
Ў госцейкі прыйшла.

Надыходзіць зорны час,
Дзед Мароз ідзе да нас.
Будзе радасць, будзе смех,
Падарункаў поўны мех.

Прыпеў.

# АУ, ДЗЕД МАРОЗ!

*Музыка і словы Я. Жабко*



— Па якой сцяжыначцы,
Дзед Мароз, блукаеш,
Можа, падаруначкі
Для дзяцей шукаеш?

Прыпеў:
Ау, Дзед Мароз!
Мы цябе чакаем,
Пра цябе, Дзед Мароз,
Песенькі спяваем.

— Па лясных сцяжыначках
Доўга я блукаў,
Пакуль ўнучку мілую
Я не адшукаў.

Прыпеў:
Я вясёлы Дзед Мароз,
Падаруначкі прынёс.
Буду вас віншаваць,
Падарункам частаваць.

# НОВЫ ГОД

*Словы К. Камейшы* *Музыка К. Цесакова*




Чакае ўся Зямля яго,
Па следзе выглядае.
Ужо ў дарозе Новы год
І хутка завітае.

Ён доўга пушчаю ішоў,
Сцяжынкай каля гаю.
І вось на ганку ён
сняжок
З валёнак абівае.

На ёлцы ўспыхнулі агні.
І зоркі карагодзяць.
І вось ён дзверы расчыніў.
І мы — у новым годзе!

# Пад Новы год—не без прыгод





*Мікола Чарняўскі*

## Пад Новы год — не без прыгод

*Навагодняя вершаваная казка*

Дзейныя асобы

Дзед Мароз
Снягурка
Сцюжа
Воўк
Ліса
Заяц
Гномы
Дзеці



На сцэне — лясная паляна. Стаіць святочная ёлка. Крышку далей, збоку — вялікі гадзіннік. Стрэлкі набліжаны да лічбы 12. Хутка Новы год. На сцэну вылятае Сцюжа, у белым адзенні з галавы да пят.

Сцюжа *(звяртаецца да дзяцей у зале)*

Я — Сцюжа, Сцюжа злая.
Чаго сюды прыйшла я?
Я ўсім спаганю свята,
Памогуць Воўк зубаты
І Лісачка-сястрыца,
На шкоду ой майстрыца!
Гэй, Воўк, Ліса, хутчэй сюды,
Нам трэба нарабіць бяды!

З'яўляюцца Воўк і Ліса.

Воўк *(да Сцюжы)*

Добры дзень, кума-сяброўка!
Цяжка ў лесе жыць без Воўка?

Сцюжа *(да Ваўка і Лісы)*

Хутка свята, Новы год.
Дзед Мароз пачаў абход.
Як праб'е дванаццаць раз —
Тут ён з'явіцца якраз,
Прынясе вяселле, смех,
Падарункаў цэлы мех.
Замяту шляхі-дарогі —
Дзед не пройдзе, стоміць ногі.

І нікуды ўжо не дзенецца,
З намі нехаця падзеліцца.

В о ў к *(паказвае на гадзіннік)*
Для пачатку ж, для напасці —
Трэба, мусіць, стрэлкі ўкрасці.

Л і с а *(падбягае да гадзінніка)*
І ніхто не будзе знаць,
Калі свята пачынаць.

Здымаюць з гадзінніка стрэлкі, хаваюць у мяшок. Азіраюцца, прыслухоўваюцца.

Л і с а *(насцярожана)*
Па дарозе скача хтосьці!
Хто яшчэ спяшае ў госці?
Каб на сцежцы не спаткацца,
Трэба нам хутчэй схавацца!

Злосна завываючы, С ц ю ж а, а з ёю В о ў к і Л і с а знікаюць. З-за ёлкі выбягае З а я ц.

З а я ц *(весела)*
Гэй, касыя, не хавайцеся,
Каля ёлкі ўсе збірайцеся!
Каб маглі ўцячы заўсёды
Ад Лісы і Воўка,—
Як і морква, неабходна
Зайцам трэніроўка!

Жвава выбягаюць з а й ц ы, весела танцуюць, падскокваюць каля ёлкі. Да ёлкі падыходзіць С н я г у р к а.

С н я г у р к а *(у захапленні)*

Красуня, ёлачка лясная,
Цябе сягоння не пазнаць:
Ты ўся іскрышся, дзіўна ззяеш
І ўсіх завеш патанцаваць.

*(Разам з зайцамі танцуе каля ёлкі. Засмучана.)*

Мой Дзед Мароз — штукар заўзяты,
Ён зранку выбраўся на свята,
Ды тут яго не бачу штось.
А дзе ж ён, дзе жаданы госць?

З а я ц *(здзіўлена)*

Ляціць, глядзіце, паштальён!
Нясе нам тэлеграму ён.

Улятае с н я г і р-п а ш т а л ь ё н з тэлеграмай.

С н я г у р к а *(бярэ тэлеграму, чытае)*

«Зранку ў лесе я блукаю,
Сцежку ўсё не адшукаю.
Кружыць-круціць Сцюжа злая,
Са шляху мяне збівае.
Выручайце, памажыце,
Мне дарогу пакажыце».

*(Звяртаецца да дзяцей у зале)*

Што рабіць нам? Не чакайце,
Можа, дзеда пагукайце.

Дзеці *(дружна)*

Дзед Мароз, не падвядзі,
Ты хутчэй да нас прыйдзі!

Дзед Мароз *(голас здалёку)*

Не магу-у-у!
Сцюжа, як віхор, лятала,
Сцежкі ўсе пазамятала.
Многа снегу — не прайсці.
Хто паможа разграбці?

Снягурка

Нам памогуць чалавечкі,
Што ў бары жывуць ля рэчкі
І, відаць, усім знаёмы.
Ну, вядома ж, гэта — гномы!

Выбягаюць гномы. Танцуюць, «разграбаюць» снег.

Дзеці

Дзед Мароз, не падвядзі,
Ты хутчэй да нас прыйдзі!

Дзед Мароз

Не магу-у-у!
Згаслі зорачкі даўно,
Мне нічога не відно.
Вы ліхтарыкі вазьміце
І дарогу асвяціце.

На сцэну выбягаюць дзеці з ліхтарыкамі, танцуюць.

Дзеці *(з залы)*

Дзед Мароз, не падвядзі,
Ты хутчэй да нас прыйдзі!

Дзед Мароз *(голас здалёку)*

Не магу-у-у!
Шмат сцяжынак прада мной,
Не знайду ніяк адной,
Той, каб мог да вас прыйсці.
Як патрэбную знайсці?

Снягурка

Між бяроз, асін і елак
Ручнікамі шлях засцелем.
Будзе снег тады не ў страх,
Шлях расчысцім, з лесу шлях.

Раздае ручнікі дзецям. Тыя перадаюць ліхтарыкі зайцам і гномам. А самі танцуюць з ручнікамі.

Дзеці *(дружна)*

Дзед Мароз, не падвядзі,
Ты хутчэй да нас прыйдзі!

Уваходзіць Дзед Мароз.

Дзед Мароз *(уздыхае, здымаючы мяшок з плячэй)*

Пад Новы год, пад Новы год
Дзівос нямала і прыгод.
Ой паблукаў! Ой нахадзіўся!
У лесе ледзь я не згубіўся.

Ды дзякуй, дзякуй шчыры вам —
І дзеткам мілым, і звярам!
Сюды без вас, маіх сяброў,
Дарогі б пэўна не знайшоў.
Пара нам свята пачынаць.
Ці б'е гадзіннік — не чуваць.
Хто вінаваты, я ўжо знаю:
Гэй, Воўк, Ліса і Сцюжа злая,
Вярніце стрэлкі! Час ляціць,
Пара, відаць, дванаццаць біць.

На сцэне з'яўляюцца Сцюжа, Ліса і Воўк, дастаюць з мяшка стрэлкі і прыладкоўваюць да гадзінніка.

Сцюжа, Воўк, Ліса *(вінавата)*
Даруйце нам! І не ганіце,
У карагод з сабой вазьміце.

Снягурка. Ну што, даруем ім?

Усе. Даруем!

Дзед Мароз
На свяце ёлкі —
Пасябруем!
А зноў нашкодзіце — тады
Вам не ўцячы ўжо ад бяды!

Сцюжа, Воўк і Ліса далучаюцца да ўсіх, хто сабраўся каля ёлкі. Пачынаюць ладзіць карагод.

Д з е д  М а р о з *(тупае побач, пастуквае кіем, радуецца)*

Што за дзіва — наша ёлка!
Што за свята — Новы год!
Ззяй жа, ёлка, як вясёлка,
Запрашай у карагод!

Гучыць вясёлая музыка. Усе сыходзяцца ў карагодзе. І тыя, хто быў на сцэне, і тыя, хто сядзеў у зале.



*Генадзь Аўласенка*

## Новы год у лесе

*Навагодняя вершаваная п'еса-казка*

Дзейныя асобы

1-ы лесавік
2-і лесавік
Заяц
1-я вавёрка
2-я вавёрка
Мышка
Мядзведзь
Лісіца
Воўк
Бабёр
Дзядуля Мароз
Снягурка
Цецярук



Перад заслонай з'яўляюцца дзядкі-лесавікі.

1-ы лесавік

Прывітанне, дружбакі!
Мы, дзядкі-лесавікі,
Завіталі ў госці зноў
Да сваіх малых сяброў!

2-і лесавік

Мы спяшаліся сюды
Праз снягі і халады.
Прабіраліся з ахвотай
Цераз гурбы і сумёты...

1-ы лесавік

Мы баяліся спыніцца,
Каб на свята не спазніцца.
Ну а зараз...

2-і лесавік

Зараз час
Віншаваць са святам вас,
Дарагія гледачы!

1-ы лесавік

Пачакай, не балбачы!
Лепей торбачку здымай,
Казку новую вымай!

2-і л е с а в і к

Дзякуй, дружа, за падказку!

*(Выцягвае з торбачкі казку.)*

Вось, трымайце, дзеці, казку
Пра Лісіцу і Ваўка,
Зайца і Цецерука...

1-ы л е с а в і к

Пра паважнага Мядзведзя,
Пра яго малых суседзяў,
Пра вавёрак і баброў...
Ды пра ўсіх лясных звяроў!

2-і л е с а в і к

Пра зіму, пра Новы год,
Пра вясёлы карагод
Каля елак і бярозак...

1-ы л е с а в і к

Пра Дзядуленьку Мароза!

2-і л е с а в і к

А цяпер — пачатак казкі!
Сустракайце, калі ласка!

Ён узмахвае рукой, адкрываецца заслона. За ёй паляна зімовага лесу. У цэнтры паляны ўпрыгожаная навагодняя ёлка.

1-ы л е с а в і к

У бары, у гушчары,
Весяліліся звяры!

Песенькі спявалі,
Танцы танцавалі,
Тупалі, скакалі...
Новы год чакалі!

2-і лесавік

Зайцы ёлку выбіралі,
Каб высокая была.
Птушкі ёлку прыбіралі,
Каб прыгожая была.

1-ы лесавік

А вавёрачкі і мышкі
Серабрылі снегам шышкі.
А паважны Цецярук
Іх развешваў, хоць без рук.

2-і лесавік

А глушцы і курапаткі
Для гасцей пяклі аладкі
І другія стравы,
Каб не быць без справы.

Лесавікі ідуць кудысьці ўбок, знікаюць у гушчары. А на палянцы з'яўляюцца звяры: Заяц, дзве вавёркі і Мышка.

Заяц

Ах, якая наша ёлка!
Як блішчаць на ёй іголкі!

1-я вавёрка
Ах, як шышкі зіхацяць!

2-я вавёрка
Нібы зорачкі ляцяць!

Мышка
Дык давайце ж танцаваць,
Нашу песеньку спяваць!

Звяры вядуць карагод вакол ёлкі, спяваюць.
На палянцы з'яўляецца Цецярук.

Цецярук
Не спявайце! Пачакайце!
Без мяне не пачынайце!

Заяц
Цецярук прыйшоў на свята!
Сапраўды, гасцей багата:
Тут і птушкі, і звяры...

З'яўляецца Мядзведзь.

Мядзведзь
Прывітанне вам, сябры!
Утрымацца я не змог,
Хоць ужо ў бярлогу лёг,
Задрамаў... ды вось...

З а я ц

Нічога!
Не ўцячэ твая бярлога!

В а в ё р к і *(разам)*

Чым ляжаць ды проста спаць —
Лепей свята сустракаць!

М я д з в е д з ь

Я таксама так мяркую.
Ну а зараз прапаную
Стаць ізноў у карагод
І спяваць пра Новы год!

Усе зноў вядуць карагод, спяваючы тую ж самую песню. Адначасова апускаецца заслона. Перад ёй з'яўляецца Л і с і ц а.

Л і с і ц а *(злосна)*

Разгуляліся звяры!
Але ж гэта да пары...
Хутка я туды прыйду,
Свой парадак навяду!
Зайца першага злаўлю!
Вельмі ж я яго люблю!

*(Аблізваецца.)*

Быць ваверкам у бядзе —
Не схаваюцца нідзе
Ад маіх ад кіпцюроў...
Палаўлю я ўсіх звяроў!

Я іх лёгка абдуру,
Зацягну ў сваю нару!
Не ўцячы й Цецеруку...
А мышэй... аддам Ваўку!

Смяецца... у гэты час з'яўляецца Воўк.

Воўк

Ты казала пра мяне?

Лісіца

Пра цябе, кумок? Ды не!
Гэта я... мышэй сачыла,
Ды яшчэ варон лічыла!
Налічыла... сто адну
За гадзіну...

Воўк

Ну і ну!
Гэтак шмат я не злічу!
Ды, прызнацца, й не хачу!
Лепей я пайду далей!

Лісіца

Пачакай жа, дуралей!
Ты, кумок, як адчуваў,
Што сюды прышыбаваў!

*(Шэптам.)*

Справа ёсць, кумок, адна!

В о ў к *(таксама шэптам)*
А ці смачная яна?

Л і с і ц а
Кіпцюры абліжаш, шэры!

В о ў к
Штосьці я не маю веры!
Ты, кума, мяне падманеш...

Л і с і ц а
Што ты, шэры!

В о ў к
А не маніш?

Л і с і ц а *(пакрыўджана)*
Ды калі я, кум, маню?!

В о ў к
Ды па сто разоў на дню!

*(Падыходзіць бліжэй.)*

Ну, дык што ў цябе за справа?
І ці будзе смачнай страва?

*(Дрыжыць ад холаду.)*

Л і с і ц а
Што з табою, мой кумок?
Дзе ж, кумок, ты так прамок?

**В о ў к**

Дзе прамок? Вядома ж, дзе!
У халоднай у вадзе!

**Л і с і ц а** *(недаўменна)*

У вадзе? Вакол зіма
І вады нідзе няма!

**В о ў к**

Калі трапіш у бяду —
Знойдзеш і зімой ваду!

**Л і с і ц а**

І з якой-такой бяды
Ты насёрбаўся вады?

**В о ў к**

Гэта ты ва ўсім сама
Вінаватая, кума!
Рыбу я хвастом лавіў,
Ды мароз ваду спавіў.
Прыхапіла так палонку,
Што не вырваць хвост з палону!

*(Уздыхае.)*

Як на тую на бяду,
Бабы выйшлі па ваду...
Толькі ўбачылі мяне —
Ды кійкамі па спіне!

Тут падбеглі мужыкі
І таксама за кійкі!
А сабакі наляцелі —
Разадраць мяне хацелі!
Добра шчэ, што лёд зламаўся...
Вой, я ледзь жывы застаўся
З-за тваёй дурной парады!

Л і с і ц а

Я, кумок, сама не рада,
Што табе яе дала...
Так кумочка падвяла!
Але хопіць гараваць,
Хопіць, шэранькі, злаваць!
Будзе ў нас з табою свята,
Будзе ў нас абед багаты!

В о ў к *(радасна)*

А ці смачны той абед?

Л і с і ц а

Накармлю цябе як след!
Ёсць задумачка адна...

*(Шэпча штосьці Ваўку на вуха.)*

Ну, і як табе яна?
Падабаецца?

В о ў к

Вядома!

Л і с і ц а

Ну, тады бяжым дадому!
Трэба ўсё падрыхтаваць,
Каб затым пабаляваць!

В о ў к з Л і с і ц а й бягуць кудысьці ўбок, зноў раскрываецца заслона, за ёй усё тая ж палянка з навагодняй ёлкай. Каля ёлкі сядзяць у чаканні З а я ц, в а в ё р к і, М ы ш к а, Ц е ц я р у к і М я д з в е д з ь.

З а я ц *(сумна)*

Вось і ёлка ёсць у нас,
І для свята самы час!
Што ж Дзядуленька Мароз
Падарункаў не прынёс?

1-я в а в ё р к а

Можа ён пра нас забыўся?

2-я в а в ё р к а

Можа ён з дарогі збіўся?

М ы ш к а

Можа з ім бяда якая?

М я д з в е д з ь

Дык чаго ж мы тут чакаем?!

*(Устае.)*

З а я ц

Ты куды? Няўжо ў бярлогу?

М я д з в е д з ь

Пабягу на дапамогу!
Пашукаю ў гушчары...
Дзед Мароз такі стары...
Мабыць збіў па гурбах ногі
І чакае дапамогі.

*(Павольна брыдзе ў лес.)*

Ц е ц я р у к

Ты ж, Мядзведзь, яго знайдзі
І на свята прывядзі!

М я д з в е д з ь *(здалёк)*

Як знайду, дык прывяду!
Ну, а раптам не знайду...

М я д з в е д з ь знікае між дрэў, усе астатнія нейкі час маўчаць.

З а я ц *(ускоквае)*

Ну, не будзем сумаваць,
Будзем лепей танцаваць!
Станем зноў у карагод —
Сёння ж свята, Новы год!

Усе становяцца ў карагод. У гэты час з'яўляецца Б а б ё р з ахапкам асінавых галінак.

Б а б ё р

Не спяшайцеся! Чакайце!
Без мяне не пачынайце!
Я прынёс для вас кары!
Хто жадае — той бяры!

З а я ц

Я жадаю! Я бяру!
Дзякуй, дружа, за кару!

Б а б ё р *(ваВёркам)*

Ну, а вы?

1-я в а в ё р к а

А мы з сястрою
Не харчуемся карою!

Ц е ц я р у к

Ды і я таксама не!
Рацыён другі ў мяне:
Я люблю з бяроз пупышкі.

В а в ё р к і *(разам)*

Мы — з сасны ці елкі шышкі.

Б а б ё р *(Мышцы)*

Ты не хочаш, Мышанятка?

М ы ш к а

Я, Бабёр, люблю зярняткі.

Б а б ё р *(кладзе галінкі на снег)*

Не жадаеце? Шкада!

З а я ц

Але ж гэта не бяда!
Мы, Бабёр, удвух з табою
Падсілкуемся карою.
Вось зярняткі ёсць для Мышкі,
Вось ляжаць ваёркам шышкі,
Вось пупышкі ад бяроз...

М ы ш к а *(сумна)*

Дзе ж Дзядуленька Мароз?

З а я ц

І Мядзведзя ўсё няма...

Ц е ц я р у к

Можа, мы сядзім дарма?

Б а б ё р

Не бядуйце! Я пайду
І абодвух іх знайду!
Пакажу ім накірунак,
Атрымаю падарунак...

З а я ц

Ну а мы?

Б а б ё р

І вы таксама!

*(Бяжыць у лес, спыняецца, азіраецца.)*

Пабягу да рэчкі прама!
Пашукаю ля вады,
І да вас хутчэй сюды!

*(Знікае між дрэў.)*

Ц е ц я р у к
І Бабёр пабег шукаць...

З а я ц
Ды не трэба сумаваць!
Пачакайце! Паглядзіце!
Да мяне хутчэй ідзіце!
Вунь ля елак і бяроз
Сам Дзядуленька Мароз
Са Снягуркаю! Ура!

Ц е ц я р у к
А Бабёр?

З а я ц
Няма Бабра!
І Мядзведзя з ім няма...

М ы ш к а
Будуць там шукаць дарма!

З'яўляецца В о ў к, які апрануты Дзедам Марозам, за ім Л і с і ц а-С н я г у р к а. На плячы ў Ваўка пусты мех.

Л і с і ц а *(Ваўку, шэптам)*
З Новым годам, гавары!

В о ў к

З Новым годам вас... звяры!

Л і с і ц а

Не звяры!
Кажы: сябры!

В о ў к

І другія... жыхары!

Л і с і ц а *(таропка)*

Мы прыйшлі да вас праз лес...

В о ў к

Згаладаліся!

Л і с і ц а *(шэптам)*

Балбес!
Лепш, наогул, памаўчы!
За вавёркамі сачы!
Калі скочаць на сасну,
Не спаймаеш ні адну!
Я ж за Зайцам прасачу,
Так схапіць яго хачу!

В о ў к *(таксама шэптам)*

А калі ж хапаць?

Л і с і ц а

Скажу!

В о ў к

Ну, дык... мех хоць развяжу!

*(Здымае мех, пачынае яго развязваць.)*

М ы ш к а *(расчаравана)*

А чаму мяшок пусты?

Ц е ц я р у к

Ды яно і сапраўды:
Дзе ж цукеркі, дзе ж ласункі?

В а в ё р к і *(разам)*

Дзе ж, дзядуля, падарункі?

В о ў к

Гэта ж, я... яна ж яго
Мне дала дзеля таго,
Каб яго я развязаў...

Л і с і ц а *(паспешліва)*

Падарункі вам раздаў!
Мех дзядулечкін, сябры,
Ён чароўны! Там, знутры,
І цукеркі, і ласункі,
І другія падарункі!
Атрымаюць іх усе!

З а я ц

Чур, я першы!

Ц е ц я р у к

Па чарзе!

В а в ё р к і *(разам)*

Занялі чаргу мы з ранку!

М ы ш к а

Я ж, наогул, на світанку!

Усе пачынаюць штурхацца.

Л і с і ц а

Стойце! Стойце! Пачакайце!
Бойкі тут не пачынайце!
Наш дзядуленька стаміўся:
Праз гушчар лясны ламіўся,
Лез па гурбах без дарогі,
Застудзіў старыя ногі...
Хай ён крышку адпачне!
Вы ж бяжыце да мяне!
Станем дружна ў карагод,
Каб спяваць пра Новы год!

Усе становяцца ў карагод. Воўк стаіць крыху ўбаку з мяшком напагатове. Усе пачынаюць вадзіць карагод і спяваць. Як толькі карагод праходзіць каля Ваўка, ён спрытна хапае самага апошняга і засоўвае ў мех спачатку Мышку, потым па чарзе вавёрак. Раптам Цецярук азіраецца.

Ц е ц я р у к *(здзіўлена)*

Дзе ж ваверкі, Мышаня?
Зніклі прама сярод дня!

З а я ц *(таксама азіраецца)*

Праўду кажаш — іх няма!

Л і с і ц а

Не шукайце іх дарма!
Мышаня пабегла ў норку,
На сасне сядзяць ваверкі...
Лепш давайце танцаваць!

Ц е ц я р у к

Гэта што з мяшка чуваць?!

К р ы к і з м я ш к а

Гэй, сюды! Дапамажыце!
Адпусціце! Развяжыце!

Ц е ц я р у к

Што такое?! Чуеш, Зай?!

З а я ц

Чую, дружа!

Лісіца раптам хапае Зайца за вушы.

Уцякай!
Нас з табою падманулі!
Гэта ж Воўк замест дзядулі!
А Снягурка — то ж Лісіца,
Даўгахвостая хітрыца!

Л і с і ц а

Воўк, хапай Цецерука!

З а я ц

Уцякай жа ад Ваўка!

Воўк кідаецца на Цецерука, але той спрытна ўхіляецца, узлятае, а Воўк ляціць носам прама ў снег.

В о ў к *(узнімаецца, трымаецца за нос)*

Вой, як трэснуўся аб пень!
Што за кепскі сёння дзень!
І сабакі, і кійкі...
А цяпер... цецерукі!

Л і с і ц а

Недарэка ты старая!
Сам — як пень!

В о ў к

Што дакараеш?!
Я ж схапіць яго хацеў!
І каб ён не паляцеў...

Л і с і ц а

А каб ты спрытнейшым быў —
Ты б яго, кумок, злавіў!

В о ў к

Ну, хоць Заяц ёсць, Лісіца!

Лісіца

Заяц той — мая здабыча!

Заяц *(жаласна)*

Адпусці мяне!

Лісіца *(насмешліва)*

Ну, не!
Планы іншыя ў мяне!

*(Засоўвае Зайца ў мех, завязвае яго.)*

Воўк

Не ў цябе, кума, а ў нас!

Лісіца

У цябе ў наступны раз!
А вось гэта не тваё!

Воўк *(недаўменна)*

Ну, а дзе ж тады маё?!

Лісіца

Цецярук — твая здабыча,
І яго ты не здабыў!

Воўк *(злосна)*

Вой, не злуй мяне, Лісіца!
Я пакуль што добрым быў!
Калі што не па нутру —
На кавалкі раздзяру!

Воўк і Лісіца цягнуць мех кожны да сябе.

Л і с і ц а

Што ж ты, шэры абармот,
Разяўляеш зараз рот
На чужое! Дай сюды!
Дачакаешся бяды!

В о ў к

Вой, не злуй мяне, кума!
Дачакаешся сама!
Я, кума, цябе вышэй!
Я, кума, цябе дужэй!
Я, кума, цябе мацней!
Я, кума, цябе...

*(Задумваецца.)*

Л і с і ц а *(падказвае)*

Дурней?

В о ў к *(узрадавана)*

Так, дурней! Дакладней, не!
Ты заблытала мяне!
Адпусці мяшок, кажу!
А не тое — укушу!

Л і с і ц а

Зубы я таксама маю!
Іх ахвотна ў ход пускаю,
Калі штосьці не па мне!
Адпусці мяшок!

В о ў к

Ну, не!
Жартаваць я не люблю:
За кіршэнь цябе схаплю,
Патрасу разоў з пяток —
Дык закрыеш свой раток!

Л і с і ц а

Ах, разбойнік! Рабаўнік!
Хоць бы ты кудысьці знік!

В о ў к

Хоць бы знікла ты сама,
Даўгахвостая кума!

Яны працягваюць тузацца, у гэты час на палянцы з'яўляюцца сапраўдныя Д з е д  М а р о з і С н я г у р к а.

Д з е д  М а р о з

З Новым годам! Што такое?!
Трапіў я на поле бою?

Воўк і Лісіца бачаць Дзеда Мароза і адразу ж спыняюць тузаніну, прыкрываюць сабой мех.

Л і с і ц а *(ліслíва)*

Вой, Дзядуленька Мароз
Падарункі нам прынёс!
Мы з Ваўком вас так чакалі...

Дзед Мароз *(азіраецца)*
Дзе ж звяры ўсе?

Лісіца
Паўцякалі!
Кажуць: што нам тое свята!
І разбегліся па хатах!
Мы ж чакалі нездарма!
Праўда ж, шэры?

Воўк
Так, кума!

Лісіца
Мы чакалі, каб на святе
Падарункі атрымаці!
Вы іх нам усе аддайце —
Мы ж падзелім...

Снягурка
Пачакайце!
Хтосьці плача тут, здаецца!

Лісіца
Гэта... гэта Воўк смяецца!

*(Непрыкметна штурхае Ваўка ў бок, той пачынае гучна рагатаць.)*

Падарункі ён чакае...

Дзед Мароз

Ты мяне не ашукаеш!
Гэта што за мех такі,
І вялізны, і цяжкі?
Што ў ім там?

Лісіца *(таропка)*

У ім? Нічога!

Галасы з мяшка

Гэй! Сюды! На дапамогу!
Гэй, ратуйце! Памажыце!
Адпусціце! Развяжыце!

Дзед Мароз

Развяжы, унучка, мех!

Снягурка ідзе да мяшка.

Лісіца

Там адзіны толькі снег!
Я яго знарок набрала:
Ёлку снегам абсыпала!

Снягурка развязвае мех, з яго выбіраюцца звяры.

Дзед Мароз

Ах ты, рыжая хітрыца!

Заяц

Гэта ўсё яна, Лісіца!

М ы ш к а

Гэта ўсё яны з Ваўком!

В а в ё р к і *(разам)*

Заявіліся цішком!
Падманулі нас! Схапілі!
Ды і ў мех нас пасадзілі!

Л і с і ц а *(спалохана)*

Я ж, Дзядуленька Мароз,
Гэта жартам, не ўсур'ёз!
Праўда ж, шэры?

В о ў к

Так, кума!
Ты зладзіла іх сама!
Я ж — дык толькі дапамог...
Сам бы я зладзіць не змог!

Л і с і ц а *(злосна)*

Памаўчы ты, дурань шэры!

З а я ц

Ім даваць не трэба веры!

М ы ш к а

Трэба іх за ўсё судзіць!

В а в ё р к і *(разам)*

Трэба ў мех іх пасадзіць!

Л і с і ц а *(Ваўку)*

Уцякаем ад бяды!

Яны бягуць у лес, але насустрач выходзіць М я д з в е д з ь, за ім з'яўляюцца Ц е ц я р у к і Б а б ё р.

М я д з в е д з ь *(хапае за шкіркі Ваўка і Лісіцу)*

Пачакайце, вы куды?!
Вы пакрыўдзілі звяроў,
Нашай пушчы жыхароў,
І цяпер адказ трымайце!
Пакаранне атрымайце!

Л і с і ц а

Не карайце! Не судзіце!

В о ў к

Дзеля свята адпусціце!

Д з е д М а р о з

Што вы скажаце, звяры,
Гэтай пушчы жыхары?

З а я ц

Добра, хай бягуць дахаты!

Мядзведзь адпускае Ваўка і Лісіцу.

М ы ш к а

Ну, а можа, дзеля свята,
Іх пакінем?

З а я ц

Воўк з Лісіцай
Будуць з намі весяліцца?!

Б а б ё р

Хай пабудуць! Сёння ж свята!

З а я ц

Тут і так гасцей багата,
Без Ваўка, і без Лісіцы!

1-я в а в ё р к а

Ну, а мы з маёй сястрыцай
Хочам Мышку падтрымаць!

2-я в а в ё р к а

Трэба сёння даруваць
Тое, што яны зрабілі!
І што ў мех нас пасадзілі...

З а я ц

Добра, сёння хай танцуюць!
Але больш так не жартуюць!

Л і с і ц а

Абяцаем танцаваць!
Болей так не жартаваць!

В о ў к

Быць з усімі ў добрай згодзе
І ў наступным нават годзе!

В о ў к  і  Л і с і ц а *(разам)*

Шчыры дзякуй вам, звяры!

С н я г у р к а

А цяпер, мае сябры,
Станем дружна ў карагод!
Сёння ж свята! Новы год!

Усе становяцца ў карагод.

А на ёлачцы для нас
У святочны гэты час
Хай заззяюць ліхтары!

Д з е д  М а р о з

Калі ласка! Раз! Два! Тры!

Ён стукае кійком, на ёлачцы запальваюцца навагоднія агеньчыкі.

З а я ц

Гляньце, ёлачка заззяла!

М ы ш к а

Дый такой прыгожай стала!

С н я г у р к а

Дык давайце танцаваць!
Ёлцы песеньку спяваць!

Усе водзяць карагод і спяваюць.
У гэты ж час закрываецца заслона, на сцэну перад ёй зноў выходзяць д з я д к і-л е с а в і к і.

1-ы лесавік

Вось і ўсё, мае сябры!

2-і лесавік

Казка скончана! Звяры
Доўга ў лесе танцавалі.

1-ы лесавік

Песні розныя спявалі.

2-і лесавік

Атрымалі падарункі:
Цацкі, пернікі, ласункі
І цукеркі...

1-ы лесавік

Нават мёду
Атрымаў Мядзведзь калоду!

2-і лесавік

Весяліліся звяры
У бары, у гушчары...

1-ы лесавік

Вы ж таксама не сумуйце —
Весяліцеся, танцуйце.

2-і лесавік

Песні розныя спявайце!

1-ы л е с а в і к

Нас, сябры, не забывайце!

2-і л е с а в і к

А цяпер нам час дахаты!

1-ы л е с а в і к

Да звяроў ідзём на свята
У бары, у гушчары...

Л е с а в і к і *(разам)*

З Новым годам вас, сябры!

*Канец*

## ЗМЕСТ

### НОВЫ ГОД! НОВЫ ГОД! ВЕСЯЛІЦЦА ЎВЕСЬ НАРОД...

**Сяргей Грахоўскі**
Новы год .......................................... 4
**Рыгор Барадулін**
Зазірнём у дзедаў мех! .......................... 5
**Леанід Дайнека**
Што прыносіць Новы год? ..................... 6
**Васіль Зуёнак**
Каля ёлкі .......................................... 7
*** Студзень тупае ў двары... ............... 8
**Валянцін Лукша**
Самае салодкае свята .......................... 9
Ліст да Дзеда Мароза ........................... 10
За што люблю я Новы год?.. ................. 11
**Уладзімір Скарынкін**
Прыгоды снежнай бабы ........................ 12
Чыя ёлка прыгажэйшая? ...................... 14
**Ніл Гілевіч**
Ёлка ................................................. 15
**Мікола Маляўка**
Ёлачка ............................................. 16
Стары год ......................................... 17
Лясная фея ....................................... 18

**Уладзімір Карызна**
Пад Новы год .................................... 19
Гуканне Дзеда Мароза ........................ 20
Навагодняя песенька ........................ 21
**Віктар Шніп**
Навагодняя казка .............................. 22
**Сяргей Патаранскі**
Калядная калыханка ......................... 23
**Міхась Пазнякоў**
Ёлка ................................................... 23
Кружацца сняжынкі ........................... 24
Вавёркі ............................................... 25
Снежны горад ..................................... 26
**Алесь Пісьмянкоў**
Першы снег ......................................... 27
Азяблая мядзведзіца ......................... 28
**Мікола Чарняўскі**
Пад Новы год... .................................. 28
Елачка ................................................ 30
Завіруха ............................................. 31
Зайкава абноўка ................................ 31
**Уладзімір Мацвеенка**
На парозе Новы год ........................... 32
Дзед Мароз ........................................ 34
Зімовыя загадкі ................................. 35
**Вера Бурлак**
*** Падары мне, Дзед Мароз... ........... 38
Заўтра ранішнік! ................................ 38
Нам бы толькі дацягнуцца ................. 39
Птушыная ялінка ............................... 39

**Генадзь Аўласенка**
*Вершы для абароны навагодніх касцюмаў*
Навагодні верш Вавёркі ........ 41
Навагодні верш Рамонка ........ 42
Навагодні верш Вожыка ........ 43
Навагодні верш Пірата ........ 43
Навагодняя песня ........ 44
**Павел Саковіч**
Дзед — вязальшчык ........ 46
Дзед Мароз і Міхасёк ........ 47
**Артур Вольскі**
Калядкі ........ 48
Як мы рады... ........ 50
**Максім Танк**
Заяц і ёлка ........ 52
**Уладзімір Мазго**
Дзе жыве Дзед Мароз ........ 53
Каляда ........ 54
**Казімір Камейша**
Белая цішыня ........ 56
**Алесь Жыгуноў**
Сняжынка ........ 57
**Міхась Скобла**
Каляда ........ 57
**Міхась Сазончык**
Навагодні светлячок ........ 59
**Аксана Спрынчан**
Навагоднія парады ........ 60
«Гвін» — заўсёдны код пінгвіна ........ 60
Сем снежных «я» ........ 61

**Віктар Шымук**
Якім ты будзеш, Новы год? ........................ 63
**Ніна Галіноўская**
Перад Новым годам .............................. 64
Навагодняе .................................... 65
Ёлчына свята .................................. 65
Чарадзейны сайт ............................... 66
Паўтарыся, сон ................................ 67
**Віктар Гардзей**
Снегавік ...................................... 69
Зімовая казка ................................. 69
У зімовым лесе ................................ 70
Добры снегавік ................................ 71
Белячок ....................................... 72
Мядзведзева лапа .............................. 72
Недарэмная любоў .............................. 73
**Яўген Міклашэўскі**
Навагодняя ноч у лесе ......................... 74

## НАВАГОДНІ КАРАГОД

**Яліначка.** Словы З. Аляксандравай, пераклад В. Жуковіча, музыка М. Красева ............... 80
**Споўненае жаданне.** Словы В. Жуковіча, музыка Э. Казачкова ............................ 81
**Яліначка.** Словы Р. Кудашавай, пераклад В. Жуковіча, музыка Л. Бекмана .................. 82
**Навагодні карагод.** Словы В. Лучанок, музыка І. Лучанка ................................ 84

**Першы школьны Новы год.** Словы А. Вольскага, музыка Г. Вагнера ........................ 86
**Ёлка-вясёлка.** Словы М. Чарняўскага, музыка А. Ізотава ........................................ 88
**Чараўніца ёлка.** Словы У. Мазго, музыка У. Сарокіна ............................................... 90
**Цудоўныя святы.** Словы В. Жуковіча, музыка А. Рэмізоўскай ...................................... 94
**Таўкачыкі.** Словы М. Маляўкі, музыка У. Казбанава ................................................. 96
**Сёння свята Новы год.** Музыка і словы Я. Жабко ..................................................... 98
**Ау, Дзед Мароз!** Музыка і словы Я. Жабко .... 100
**Новы год.** Словы К. Камейшы, музыка К. Цесакова ................................................... 102

## ПАД НОВЫ ГОД — НЕ БЕЗ ПРЫГОД

**Мікола Чарняўскі**
Пад Новы год — не без прыгод ................. 105

**Генадзь Аўласенка**
Новы год у лесе ........................................ 115

**З Новым годам!** : вершы, песні, п'есы, казкі,
З-11 загадкі / уклад. У. М. Мазго; іл. А. В. Пазняка. —
Мінск : Маст. літ., 2009.— 151 с. : іл.

ISBN 978-985-02-1118-7.

У арыгінальны зборнік увайшлі вершы, песні, п'есы, казкі і загадкі беларускіх аўтараў, прысвечаныя самаму вясёламу і жаданаму для ўсіх святу, якое аднолькава любяць дарослыя і дзеці. Разам з гэтай кнігай у кожны дом нібы завітае Новы год...

**УДК 821.161.3-8**
**ББК 84(4Беи)**

Літаратурна-мастацкае выданне

З НОВЫМ ГОДАМ!

*Вершы, песні, п'есы, казкі, загадкі*

Укладальнік
МАЗГО Уладзімір Мінавіч

Рэдактары *А. С. Масла, Н. В. Філіповіч*
Мастацкі рэдактар *А. В. Пазняк*
Тэхнічны рэдактар *Л. С. Зубец*
Стылістычныя рэдактары *М. А. Паддубская, А. М. Анцытовіч*

Падпісана да друку 29.09.09. Фармат $70x100^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Пецярбург. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 12,35.
Улік.-выд. арк. 6,61. Тыраж 3000 экз. Заказ 119.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494049 ад 03.02.2009. Праспект Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by, e-mail: mail@mastlit.by

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛИ № 02330/0494156 ад 03.04.2009. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.





ISBN 978-985-02-1118-7
9 789850 211187

З новым годам!

